*Секцыя 6*

**УНЁСАК РОДУ КУЛЯШОВЫХ У ВЫВУЧЭННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ ФАЛЬКЛОРУ**
***(да 100-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова)***

---

–

***Вячаслаў Калацэй***

## ЗАЛАТОЕ СЯЧЭННЕ «ВЫСОКАГА РЭНЕСАНСУ» ФАЛЬКЛОРУ
***(аналіз абставін і наступстваў арганізацыі першых этнаграфічных канцэртаў у Мінску)***

Тыя, хто сачыў за музычнай перыёдыкай СССР 1960-х гадоў, заўважыў, што часопіс «Советская музыка» (№ 10 за 1968 год) апублікаваў артыкул «За народнае – супраць псеўданароднага», у якім асуджаліся факты нігілістычных адносін да народных мастацкіх традыцый і фальклору. Гаворка ў ім ішла пра ўпершыню арганізаваныя ў Беларусі музычна-этнаграфічныя канцэрты. Рэдакцыя падкрэслівала: «Цяпер цікавасць шырокіх мас да сапраўднага фальклору незвычайна пабольшыла... У дадзеных умовах «высокага рэнесансу» фальклору ўсе меры, скіраваныя на яго распаўсюд і папулярызацыю, усе намаганні энтузіястаў, якія спрыяюць яго ўважліваму і пільнаму вывучэнню, заслугоўваюць самай сур'ёзнай падтрымкі [1, с.100]».





*Малюнак 1* – Жаночы і мужчынскі гурты вёскі Клятная на этнаграфічным канцэрце ў Саюзе пісьменнікаў, 1968

Рэзананс ад першага мінскага этнаграфічнага канцэрта (мал. 1) сучаснікі характарызавалі як «фурор», а амаль усе «лаўры» (трэба дадаць, што адначасова – і менш прыемная «аддача») дасталіся харызматычнай Зінаідзе Мажэйка – галоўнай завадатарцы канцэрта і аўтарытэтнаму даследчыку палескай спеўнай традыцыі. «Узлёт маладога музыказнаўцы-фалькларыста ... вянчае памятны з 1968 г. этнаграфічны канцэрт-паказ «жывых герояў палескіх легенд», які моцна кантраставаў са звыклымі для слыху і ўспрымання забаўляльнымі канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Настальгічна выбуховае ўздзеянне яго на беларускую грамадскасць не пакінула абыякавымі ні творчую інтэлігенцыю, ні афіцыйнае чынавенства ад культуры. Першая ўспрыняла гэты знакавы паказ народных «спевакоў» як пачатак новага адраджэння беларускай нацыянальнай культуры. Так, этнограф М. Грынблат амаль са слязамі прамаўляў: «Як быццам гэта старонкі майго жыцця 1920-х гадоў. Гэта – я на творчым грэбні хвалі нацыянальнага адраджэння выступаю ў самабытным «тэатры на калёсах» трупы Уладзіслава Галубка [1, с.19]!».

Паплечніцай Мажэйкі па арганізацыі гэтай знакавай для айчыннай практычнай фалькларыстыцы падзеі была Аксана Куляшова (мал. 2) – супрацоўніца беларускага Саюза пісьменнікаў і жонка вядомага паэта. Аксану Фёдараўну Куляшову (1912 – 2005) выхавала ў засценку Машчыцы на Случчыне цётка, бацькі ж яе былі пахаваны ў Улле (Віцебшчына). Гэтая сціплая і разважлівая жанчына пражыла доўгае і насычанае жыццё, у якім метадычна падзяляла ўсе ўзлёты і нядолі сваіх таленавітых крэўных (мал. 2). Шырокае прызнанне таленту мужа, творчасць і арганізацыйная дзейнасць дачкі Валянціны (літаратуразнаўцы, педагога, перакладчыка, аўтара тэлепраграмы «Літаратурная Беларусь» і літаратурных вечароў у філармоніі), кар'ера ўнука Уладзіміра (этнаграфа, дудара і лідара гурта «Ліцьвіны») праходзілі пры яе падтрымцы і непасрэдным удзеле. Пры ўсёй паспяховасці этнаграфічнага канцэрта 1968 года, Куляшова не магла не разумець усёй экзатычнасці аўтэнтычнага фальклору для тагачасовай кіруючай эліты, да і для часткі мінскай інтэлігенцыі. Зінаіда Мажэйка казала: «Помню 1968 год. Наладзілі мы з Верай Палтаран і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ксанай Куляшовай этнамузычны канцэрт у Саюзе пісьменнікаў – абвінавацілі ў нацыяналізме. У 1972-м зняла першы музычна-этнаграфічны фільм «Палескія калядкі» – пасыпаліся папрокі, што прапаведую рэлігію. У 1979-м і 1982-м зняла вядомыя «Галасы вякоў» і «Памяць стагоддзяў» пра веснавыя, летнія, восеньскія і зімовыя песенныя абрады і звычаі – навалiлiся з крытыкай, што ўслаўляю старамодную, аджылую, «бесперспектыўную» вёску. У 1986 годзе, калі выйшла кінастужка «Палескія вяселлі», мае апаненты нібы прыгавор падпісалі - выступаю супраць антыалкагольнай кампаніі. А ў 1994-м, калі выйшаў на экраны фільм «Крывыя вечары», пачалі ўшчуваць (вось парадокс!) за надта атэістычную падачу. Словам, усё даецца з боем» [1, с.130].





*Малюнак 2* – А.Куляшоў з сям’ёй (сын Уладзімір, жонка Аксана Фёдараўна, унук Уладзімір, Ірына Рогава, дачка Валянціна, сын Аляксандр і Аркадзь Куляшоў); А.Куляшова, 1960

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сям’і Куляшовых поспех і перспектывы этнаграфічных канцэртаў абмяркоўваліся сціпла, з падачы бацькі тут была прынята «больш рабіць, чым размаўляць». Аднак, была відавочна, што дзейнасць па масавай папулярызацыі традыцыйнай музыкі беларусаў, распачатая З.Мажэйкай, В.Палтаран і А.Куляшовай у 1968 годзе, мела значэнне і прэцэдэнта, і эксперымента «на перспектыву» адначасова. Спалучэнне фальклору са сферай медыа і сферай фонаіндустрыі мела хуткі і паспяховы працяг. Першыя этнаграфічныя канцэрты былі прадэманстраваны па беларускім тэлебачанні, што вельмі значна павялічыла аўдыторыю спажыўцоў традыцыйнага мастацтва. Тыя тэлепраграмы мелі поспех і заклалі традыцыі існавання на радыё і тэлебачанні Беларусі «фальклорнай медыйнай перыёдыкі». Адначасова – аўтэнтычныя спевы сталі паступова набываць статус аднога з прадуктаў фонаіндустрыі, прычым – фонаіндустрыі міжнароднай. З. Мажэйка адзначала: «Яшчэ ў 1971 годзе, калі ў Маскве праходзіў Міжнародны музычны кангрэс, мне ўдалося паказаць там некалькі самабытных народных песень з палескіх сёлаў і вёсак. Іх слухалі з задавальненнем. Слухачам адкрыўся дзіўны свет сялянскага мастацтва Палесся. Праз некалькі гадоў ЮНЕСКА замовіла міністэрствам замежных спраў і культуры рэспублікі кружэлку аўтэнтычнага фальклору.

Разам з калегам – этнамузыколам І.Назінай мы шмат ездзілі па палескіх вёсках і сёлах, слухалі і адбіралі лепшых народных спевакоў і музыкаў. Запісы рабілі на вольным паветры сярод абшараў беларускіх палёў – у студыі мы б страцілі ўвесь каларыт спеваў. Так рыхтавалася кружэлка. Першы бок яе прысвечаны каляндарнаму (калядкі, вяснянкі, жніўныя мелодыі) і вясельнаму фальклору. Выканаўцы граюць на рэдкіх народных інструментах – самаробных дудачках, саламяным «пішчыку», а таксама на скрыпцы. Другі бок перад прадстаўляе народную песенную лірыку ў шматгалосным выкананні, партызанскія песні, танцавальныя найгрышы. Гэтая кружэлка ў 1988 годзе атрымала другое жыццё: перакладзеная на лазерны кампакт-дыск – апошняе дасягненне сусветнай тэхнікі ў галіне грамзапіса. Ён забяспечвае выключна высокую чысціню гучання, даўгавечнасць. Кампакт-дыск з палескімі мелодыямі ўганараваны «Гран-пры» Французскай акадэміі музычных запісаў і Міжнароднага музычнага савета [1, с.126]».

«З тых часоў у прапагандзе сапраўднага народнага мастацтва Беларусі адбыліся некаторыя зрухі. З'явіліся першыя кнігі шматтомнага збору беларускага фальклору, падрыхтаваныя Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Народную песню ў яе спрадвечным, першапачатковым выглядзе можна пачуць у перадачах радыёклуба «Фальклор». Самабытныя народныя ансамблі выступаюць не толькі ў канцэртах мастацкай самадзейнасці, але час ад часу таксама і ў спецыялізаваных этнаграфічных праграмах (мал. 3)» [100], – адзначала З.Мажэйка сітуацыю з фальклорам у Беларусі пасля 1968 года. Унук Аксаны Куляшовай Уладзімір Бярбераў (адзін з тых, хто бачыў першыя этнаграфічныя канцэрты ў Мінску) лічыць, што этнаканцэрты паўплывалі не толькі на з'яўленне этнічна арыентаваных аб'яднанняў гарадской беларускай моладзі (у першую чаргу – «Майстроўні»), але і на масавую нацыянальна арыентаваную культуру – напрыклад, на феномен ансамбля «Песняры». Трэба адзначыць, што і з'яўленне яго гурта «Ліцьвіны» ў 1990-х – годнае перайманне і працяг у новых сацыякультурных умовах той вобразнасці і

эстэтыкі каранёвага мастацтва беларусаў, якія ён назіраў на этнаграфічных канцэртах свайго дзяцінства, наладжаных пры дапамозе яго бабулі.




*Малюнак 3* – Палескія спевакі [3] і сямейны дуэт Сцяпана і Марыі Дубейка [2] на этнаграфічным канцэрце ў кансерваторыі (Мінск)

**Спіс літаратуры:**


1. Мажэйка, Зінаіда Якаўлеўна : да 50-годдзя навуковай і творчай дзейнасці / уклад. Т.Якіменка, Т.Бярковіч. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 141 с.
2. Можейко, З.Я. Исследования 60 – 90-х годов // Белорусская этномузыкология : очерки истории (XIX – XX вв.) / З. Можейко, Т. Якименко, Т. Варфоломеева и др.; Под ред. З. Можейко. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 254 с.
3. Можейко, З.Я. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / З. Я. Можейко. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 147 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ